**АЛЕСЬ КІРКЕВІЧ.**
**“ІДЭАЛЬНАЯ ГОРАДНЯ” ГАНСА АДЭЛЬГАЎЗЕРА**

**Крыніца публікацыі:**
*Кіркевіч. А. “Ідэальная Горадня” Ганса Адэльгаўзера [Электронны рэсурс] / Алесь Кіркевіч // Сайт “Будзьма беларусамі!”. – Рэжым доступу: http://budzma.by/news/idealnaya-horadnya-hansa-adelhawzyera.html. – Дата доступу: 15.11.2018 г.*

**Пакуль дызайнеры спрачаюцца наконт гарадскога брэнду, найбольш пазнавальная выява Горадні ўжо створаная — 450 гадоў таму.**

…Ліпень 1567-га. Доўжыцца цяжкая і рызыкоўная для княства Інфлянцкая вайна. У Горадню прыбываюць адразу чатыры пасольствы: маскоўскае, турэцкае, татарскае і валашскае. Пад гэтую марку падцягваецца ўвесь уладны бамонд Кароны і Вялікага Княства. На месяц горад робіцца палітычнай сталіцай Рэчы Паспалітай, якая будзе абвешчаная праз два гады. Нямецкі мастак Ганс Адэльгаўзер піша накіды на больш чым дзесятак лістоў, з якіх па вяртанні на радзіму праз год паўстане ці не найлепшая выява сярэднявечнага горада ў гісторыі Беларусі.

Выяву горада над Нёманам, а згодна з гравюрай — над Кронанам, у выкананні Адэльгаўзера ў Горадні ведае ці не кожны школьнік. І не толькі з падручнікаў ці кніжак Арлова: хрэстаматыйная сярэднявечная выява горада ўсё часцей з’яўляецца ў вітрынах крамаў альбо на сценах летніх кавярняў. Міжволі, без усялякіх конкурсаў і тэндараў, гравюра стала самай пазнавальнай тыражаванай выявай места.

Пра таямніцы, адметнасці і перспектывы “жывога летапісу” магдэбургскай Горадні мы вырашылі пагутарыць з **Сяргеем Салеем**, які не першы год займаецца вывучэннем медзярыту.



**Мазаіка гравюры**

“Насуперак першаснаму ўспрыняццю, — тлумачыць Сяргей, — Адэльгаўзер маляваў не ўсю панараму адразу, а рабіў шмат накідаў, якія ўжо пасля аб’яднаў у адну выяву. Цяпер вядомыя як мінімум тры месцы на Занёманскім фарштаце, адкуль ён мог назіраць той ці іншы краявід”.

Тут, па словах даследчыка, і палягае дакладнасць і недакладнасць гравюры адначасова: прамаляваўшы асобныя будынкі, аўтар не заўжды мог іх дакладна сумясціць на этапе вырабу цэласнай выявы. Таму архітэктурныя дэталі — як на фота, а вось тапаграфічнае размяшчэнне часам кульгае: Прачысценская царква, напрыклад, калі глядзець з-за Нёмана, была б не бачная з-за каралеўскага дома, які стаіць на месцы Новага замка, а ў Адэльгаўзера — бачная!

**Людзі гравюры**

“Унікальнасць працы Адэльгаўзера, — працягвае даследчык, — у сумяшчэнні архітэктурнага фактару і чалавечага: мы бачым як дакладныя выявы будынкаў, так і дакладных прамаляваных людзей з іх заняткамі: хлапец ганяе курэй з дубцом, гарбары працуюць са скурай на беразе Нёмана… Звычайна было альбо-альбо: ці людзі, ці архітэктура. А тут сінтэз, рэнесансны ўплыў”.

Варта адзначыць, што на гравюры няма ніводнага аднолькавага твару. Больш за тое, аўтар падкрэсліў нават розніцу ў абліччах ды вопратцы маскавітаў і паслоў Вялікага Княства, якія паціскаюць адзін аднаму рукі, зафіксаваўшы “сустрэчу цывілізацыяў”. Маскавіты — гэта крывыя шаблі, сонейкі на шчытах, шапкі-ерыхонкі, азіяцкія скулы ды курносыя твары. Геніяльны немец заўважыў нават, як гарадзенцы асцярожна глядзяць на іх з вокнаў дамоў, не выходзячы на двор.



“Даследчыкі, якія працуюць з арыгіналам гравюры, — дадае Салей, — адзначаюць нават вонкавае падабенства выяўленага маршалка ВКЛ Валовіча, які цісне руку маскавіту Фёдару Колычаву, з рэальным Валовічам, паводле партрэтаў. То бок дакладнасць Адэльгаўзера — фатаграфічная!”

**Адкрыцці гравюры**

Рэч у тым, што інфармацыі пра Горадню гэтага часу не так і шмат, тым больш візуальнай, таму медзярыт Адэльгаўзера стаў ледзь не ўніверсальнай крыніцай ведаў пра архітэктуру горада другой паловы XVI ст. Менавіта паводле яго можна меркаваць, як выглядаў замак Вітаўта, Фара альбо Каложская царква. Што цікава, усе важныя будынкі падпісаныя аўтарам зверху на лаціне і па- нямецку — таму атрымліваецца ледзь не комікс альбо журналісцкая замалёўка для тагачаснага заходнееўрапейскага чытача.

Разам з тым гравюра хавае шмат слаёў інфармацыі, і тое, што падавалася ўчора недакладнасцю аўтара, сёння — даведзены навукоўцамі факт.

Добры прыклад — Каложская царква на гравюры. Доўгі час лічылася, што аўтар намаляваў яе неахайна і вельмі алегарычна: і вонкава не падобная, і Нёман яе на гравюры аддзяляе ад замка, хоць у рэальнасці яны на адным баку ракі. Сяргей Салей тлумачыць, што з Нёманам акурат намудрылі даследчыкі — Каложу ад замка на выяве аддзяляе Гараднічанка (раней — Юрыздыка), што ўпадае ў Нёман, як у рэальнасці, якую проста раней прымалі за Нёман.



З выглядам царквы таксама ўсё грае: гісторык Андрэй Вашкевіч нядаўна давёў, што ў Каложы цалкам магла быць званіца з боку Нёмана, пра якую ніхто раней не ведаў, — акурат як на гравюры (яе і лічылі выдумкай немца). Пасля абвалу ад яе проста не засталося слядоў, як і ад усёй заходняй сцяны. Адэльгаўзер зноўку мае рацыю!

**Аўтар гравюры**

Акрамя архітэктурных і тапаграфічных таямніцаў загадкай застаецца і… сам аўтар выявы. Калі Матыяс Цюнт, які выдрукаваў медзярыт, — цалкам рэальны чалавек, то пра Ганса Адэльгаўзера аніякай інфармацыі няма…

“Гэта сапраўды вельмі дзіўна, — падкрэслівае Сяргей, — бо немцы заўжды ўсё занатоўвалі, інфармацыя на асобаў нават па XVI ст. ёсць, але такога чалавека нідзе няма. У Нямеччыне ёсць горад Адэльгаўзер — мажліва, адсюль паходзіць яго псеўданім”.

Даследчык таксама дадае, што падчас сустрэчаў з пасольствамі ў горадзе дзейнічалі італьянскія і прускія шпіёны. Таму, улічваючы ў наўпростым сэнсе фатаграфічнасць выявы, можна дапусціць, што і яе аўтар займаўся не чыстым мастацтвам.

**Кошт гравюры**

Спецыфіка вытворчасці медзярытаў на час жыцця Адэльгаўзера і Цюнта палягала ў тым, што мастак рабіў замалёўкі, якія пасля пераносіліся на дошку, друкаваліся выявы на продаж, а дошкі знішчаліся, каб ніхто іншы не мог запусціць масавы друк той жа выявы і збіць цану на прадукцыю. У выніку цяпер у свеце вядома з дзясятак арыгінальных асобнікаў, пры гэтым — ніводнага ў Беларусі…

“Дырэктар гарадзенскага музея апошні раз спрабаваў яе набыць у 2008 годзе, але не хапіла грошай, — паціскае плячыма Салей. — Там цікавая гісторыя была: палякі, ведаючы, што да чаго, набылі яе ў звычайнай антыкварнай краме ў Швецыі за 10 тысяч даляраў і выставілі на аўкцыён, з якога яна пайшла за 40, — гэта і ёсць яе прыкладны сучасны кошт”.

Адзінае, чым валодае Гарадзенскі гістарычны музей, — гэта гравюра Браўна, зробленая паводле арыгіналу Адэльгаўзера праз пэўны час: каляровая, але нашмат менш дакладная. Яе рынкавы кошт цалкам пасільны нават для прыватных калекцыянераў — 300-400 еўра. А вось па арыгінал гарадзенскім гісторыкам дагэтуль трэба ездзіць у польскія архівы, плацячы за карыстанне якаснымі сканамі.




**Перспектывы гравюры**

“Ужо зусім хутка, у 2017-м годзе, будзе 450-годзе той легендарнай сустрэчы пасольстваў, — зазначае Сяргей, — у 2018-м — 450-годзе стварэння гравюры. Для горада было б вельмі важна адзначыць гэтыя падзеі: гэта можа быць анімаваная экскурсія па месцах, выяўленых на медзярыце. Адна з залаў музея, пра рэканструкцыю якой увесь час кажуць, можна было б назваць “Горадня, ліпень 1567- га”, адлюстраваўшы горад і людзей таго часу. Гісторык Андрэй Чарнякевіч прапанаваў нават зрабіць паводле гравюры мульцік…”

Сяргей Салей упэўнены, што папулярызацыя ўнікальнага медзярыту — гэта не проста памнажэнне яго выяваў у горадзе ды інтэрнэце, але і асэнсаванне яго культурных кодаў. А якія гэта коды? Па-першае, еўрапейскі, а не азіяцкі горад. Цэнтр палітычных падзеяў, а не правінцыя. Урэшце, гарадская беларуская культура, а не зацяганыя штампы “вясковасці”.

Варта адзначыць, што большасць гістарычных выяваў беларускіх гарадоў, якія цяпер спрабуюць тыражаваць, абапіраюцца на паштоўкі — “царскага” ці “польскага” часу. У гэтым сэнсе выкарыстанне гравюры XVI ст. — гэта актуалізацыя менавіта свайго мінулага, звязанага з “залатым векам” Вялікага Княства Літоўскага, што ёсць таксама праявай патрыятызму.

“Але пачаць, на маю думку, усё ж такі варта са стварэння міждысцыплінарнай даследчыцкай групы,

— рэзюмуе Сяргей Салей, — куды ўваходзілі б і геральдысты, і знаўцы старадаўняй зброі, і спецы ад архітэктуры. Уявіце на хвілінку, што мы вывучаем фота з XVI ст., і спрабуйце асэнсаваць колькасць ведаў, якія мы можам адтуль узяць. Такая праца не патрабуе шалёных грошай, а таямніцаў і сюрпрызаў, упэўнены, нас у такім выпадку чакае безліч!”

**2015 год.**